# І ЯНКІ КУПАЛЫ




У 1909 годзе маці песняра Бянігна Іванаўна Луцэвіч узяла ў арэнду хутар у Акопах. Апрацоўваючы гэту зямлю, палову свайго прыбытку яна павінна была аддаваць гаспадыні, пані Жалігоўскай. Разам з сёстрамі Янкі Купалы яны пражылі тут да 1929 года, а сам паэт праводзіў у іх летнія вакацыі.

Янка Купала ўпершыню прыехаў у Акопы ў 1912 годзе. Разам з Антонам Грыневічам ён накіроўваўся ў вёску Жукаўка, каб на кірмашы паслухаць народныя казкі, песні, паданні. І, натуральна, заехаў у дом маці. Падмуркі гэтай хаты (іх закладвалі яшчэ Жалігоўскія) захаваліся і да сёння.

Сядзібу быццам трайнымі зубцамі акружае лес. Купала любіў выйсці на ганак і глядзець на сілуэты дрэў у далечыні. На падворку калісьці стаялі пуня, калодзеж і лазня, ад якой можна было спусціцца да яра, дзе быў невялікі ставок.

Янка Купала пісаў свае творы, прымасціўшыся на вялізным валуне, які размяшчаўся непадалёк, пасярод жытнёвага поля. Валун і сёння, як калыска творчасці песняра, стаіць пасярод поля і слухае калыханкі каласоў і зорак.

Паэт проста не мог не пісаць на такой маляўнічай зямлі. Як сцвярджаюць літаратуразнаўцы, у Акопах ім было створана каля 50 вершаў, былі распачатыя многія драматычныя творы.

> На падворку ў Акопах у 1992 годзе быў устаноўлены камень, на якім размясцілі шыльду з радкамі Янкі Купалы, якія апяваюць прыгажосць навакольнай прыроды:
>
> *Песняй вясны лебядзінаю,*
> *Скінуўшы зімнія чары,*
> *Шэпчуцца явар з калінаю*
> *Ў сумнай даліне над ярам.*

Чаму ж сям'я Луцэвічаў пакінула такое месца? Пра гэты факт біяграфіі песняра раней не прынята было казаць. У 1929-м, калі праводзілася калектывізацыя і людзей прымусова высялялі з хутароў, сумны лёс не мінуў і сям'ю народнага паэта. Бянігна Іванаўна Луцэвіч не адрэагавала на новую пастанову. Таму праз пэўны час да іх прыйшлі прадстаўнікі адпаведных органаў, прымусілі пакінуць дом і разам з дочкамі пасадзілі ў цягнік, што ішоў у кірунку Сібіры. Толькі дзякуючы ўплыву Янкі Купалы ўдалося зняць іх з цягніка ў Барысаве. Сядзіба ў Акопах засталася разбуранай, далучылася да ліку раскіданых гнёздаў, якіх на Беларусі было вельмі шмат...

У літаратуразнаўчых працах савецкага часу пра Акопы стараліся не згадваць. А творы, напісаныя тут, залічвалі да пецярбургскага перыяду жыцця Купалы. Казалі, што менавіта там было створана ўсё самае значнае. Аднак насамрэч на Лагойшчыне, прыязджаючы сюды на летнія вакацыі, паэт стварыў паэмы «Курган», «Бандароўна», «Яна і Я» і многае іншае. Акопы з'яўляюцца менавіта літаратурнай калыскай.

### Калі ажываюць героі. Харужанцы

У суседняй вёсцы Харужанцы жыла сястра Купалы. І ён часам прыязджаў да яе ў госці. Два разы на год тут праходзілі кірмашы — веснавы і восеньскі. Янка Купала завітваў на іх, гутарыў з людзьмі.

У 1992 годзе спецыяльная камісія вырашала, дзе стварыць музей народнага песняра. Палічылі, што пасярод поля, у Акопах, дзе няма ні дарог, ні электрычнасці, рабіць музей не вельмі зручна. Таму для гэтай задумы выбралі суседнюю вёску Харужанцы, дзе жыла сястра Купалы. Там і абсталявалі сядзібу. Для музея ўзвялі дом – тыповую пабудову канца XIX стагоддзя.

Ля ўваходу стаіць вялізны камень, прывезены з лагойскіх палёў. На ім можна прачытаць:

*К табе, о Божа,*
*І я ў дзень гэты просьбу шлю:*
*Хай Беларусь, мая старонка,*
*Ўваскрэсне к вольнаму жыццю.*

Музей быў адкрыты ў 1992 годзе, да 110-годдзя з дня нараджэння паэта. Тады ж тут быў усталяваны помнік песняру.



Варта адзначыць, што экспазіцыя музея сапраўды ўражвае. Усе перыяды жыцця паэта прадстаўлены дасканала, можна ўбачыць шмат яго фотаздымкаў — ад дзіцячых да сталых. На нас пазіраюць і героі Купалавых п'ес — артысты тэатра імя Янкі Купалы розных часоў. Ёсць тут і здымак Паўліны Мядзёлкі. Можна даведацца пра няпросты лёс твораў песняра.

Аднак ці наведваюць турысты гэты адметны музей?.. Яго загадчык Валянцін Жарко адзначае, што госці здараюцца тут зусім не часта...

***

Беларускую літаратурную вандроўку карэспандэнтам «Звязды» здзейсніць удалося. І гэта толькі адзін з многіх магчымых маршрутаў. Але сюды не паедзе «масавы» турыст. Завітаюць хіба што энтузіясты, аматары літаратуры.

Выпраўляючыся ў такое падарожжа, трэба быць гатовым і да захаплення, і да смутку. Захапленне маляўнічымі краявідамі, памятнымі, невядомымі раней месцамі. Смутку з-за забыцця, якое праглядае ў гэтых мясцінах...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
*Лагойскі раён*

# ПОЯС ЯК БЯССПРЭЧНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

## Падчас «Славянскага базару» ў Віцебскім мастацкім музеі можна будзе пабачыць унікальны «пояс Вітаўта» з калекцыі Нацыянальнага гістарычнага музея

**Што мы называем гісторыка-культурнай каштоўнасцю? І што — нацыянальнай рэліквіяй? На першае пытанне адказаць, напэўна, дастаткова проста: гэта створаны чалавекам аб'ект ці вынік яго духоўнай творчасці, які мае адметныя вартасці, што ўяўляюць каштоўнасць для асобнага народа ці ўсёй чалавечай супольнасці. Вызначэннем таго, ці з'яўляецца пэўны прадмет гісторыка-культурнай каштоўнасцю, займаюцца спецыялісты. Досыць часта здараецца так, што пэўныя вартасці той ці іншай гісторыка-культурнай каштоўнасці застаюцца зразумелымі толькі для адмыслоўцаў. Але ёсць і выключэнні. Некаторыя старажытныя прадметы з цягам часу становяцца своеасаблівымі сімваламі народа, у якіх увасабляюцца яго ўяўленні аб мінуўшчыне, выданых асобах розных эпох, літаратурных і культурных набытках папярэдніх пакаленняў. Менавіта яны і з'яўляюцца нацыянальнымі рэліквіямі.**


Паясны набор са скарбу з-пад вёскі Літва.

Для беларусаў такімі бясспрэчнымі каштоўнасцямі, якія дайшлі да нас з глыбіні сівых стагоддзяў, праз завірухі ліхалеццяў з'яўляюцца Крыж Еўфрасінні Полацкай, Полацкі Сафійскі сабор, Каложская царква ў Гродне, Камянецкая вежа, кнігі Францыска Скарыны, палацы ў Міры ды Нясвіжы, слуцкія паясы... З нядаўняга часу гэты шэраг папоўніўся яшчэ адным унікальным прадметам, за якім ужо трывала замацавалася назва «пояс Вітаўта».

Пояс паходзіць са скарбу, знойдзенага ля вёскі Літва Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў 1992 годзе і з'яўляецца адным з самых буйных, з тых, што калі-небудзь былі знойдзены ў беларускай зямлі. На жаль, сам скарб быў раскрадзены ўжо падчас яго выяўлення, і толькі пасля шматлікіх «прыгод» частка каштоўнасцяў паступіла ў зборы беларускіх музеяў. Нават захаваная яго частка ўражвае: зберагліся 6 244 срэбныя манеты і ўнікальны паясны набор. Яшчэ адзін паясны набор, сярэбраны посуд і нейкая частка манет (магчыма, нават большая) «растварыліся» ў прыватных калекцыях.

Большасць манет са скарбу з-пад вёскі Літва была адчаканена ў Чэхіі ў канцы XIV — пачатку XV стагоддзя, у часы панавання караля Вацлава IV Люксембургскага. Гэта так званыя пражскія грошы, якія чаканіліся ў Чэхіі з 1300 года. Выяўленне ў беларускай зямлі такой велізарнай колькасці чэшскіх манет не выклікае здзіўлення, бо ў XIV—XV стагоддзях менавіта пражскія грошы сталі асновай грашовага абарачэння ў Вялікім Княстве Літоўскім.

Унікальнай знаходкай з'яўляецца паясны набор, які складаецца з адзінаццаці сярэбраных пласцін круглай і зоркападобнай формы, упрыгожаных гравіроўкай, чарненнем і залачэннем, а таксама арнаментаванай чаканкай спражкі, наканечніка і яшчэ чатырох неарнаментаваных пласцін. Усе гэтыя дэталі калісьці мацаваліся на аснову са скуры ці тканіны, якая не захавалася. На думку выдатнага расійскага даследчыка залатаардынскага мастацтва Марка Крамароўскага, пояс, да якога належалі накладкі, быў выраблены ў канцы XIV — першай трэці XV стагоддзя ўсходнекрымскімі майстрамі на заказ кагосьці з татарскіх уладароў Крыма ці яго высокапастаўленых набліжаных.

Якім чынам пояс, выраблены крымскімі майстрамі для татарскіх ханаў, трапіў у скарб, знойдзены ў маладзечанскай зямлі? Вядома, што татары здзяйснялі незлічоныя набегі на землі Вялікага Княства Літоўскага. Ці не з'яўляецца скарб з-пад вёскі Літва сведчаннем аднаго з іх? Напэўна, не. Вядома, што ў эпоху Сярэднявечча дыпламатычныя місіі абменьваліся не толькі граматамі і дакументамі, але і падарункамі. Да іх ліку маглі належаць вырабы з каштоўных металаў, заморскія дзівосы і шмат якія іншыя незвычайныя рэчы. Уручэнне падарункаў суправаджалася адпаведнымі цырымоніямі, парушэнне якіх магло прывесці да абразы прымаючага боку ці самых пасла і сарваць усе мэты пасольства. Верагодна, менавіта такім пасольскім падарункам з'яўляецца і пояс са скарбу з-пад вёскі Літва, бо залатыя і срэбныя паясы высока цаніліся ў княжацкім і магнацкім асяродку, дзе яны былі сведчаннямі статусу і багацця іх уладальнікаў.

Некаторыя навукоўцы выказваюць думку, што пояс быў падараваны татарскімі пасламі вялікаму князю Вітаўту — самаму магутнаму і знакамітаму валадару Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта таму сярэбраны залачоны пояс атрымаў назву «пояс Вітаўта», якая хутка за ім замацавалася і цяпер ужо ўспрымаецца як агульнапрынятае азначэнне.

Зразумела, сёння складана з поўнай упэўненасцю казаць, каму татарскія паслы маглі падараваць каштоўны пояс. Магчыма, гэта сапраўды быў сам вялікі князь Вітаўт альбо хтосьці з яго сваякоў ці прадстаўнікоў найбліжэйшага княжацкага атачэння. Аднак пра тое, якім чынам найкаштоўнейшы пояс і велізарная колькасць манет трапілі ў зямлю, можна меркаваць дастаткова ўпэўнена.

На падставе аналізу манетнай часткі скарбу з-пад вёскі Літва вядомы беларускі нумізмат Валянцін Рабцэвіч вызначыў, што ён быў схаваны падчас грамадзянскай вайны, якая разгарэлася ў Вялікім Княстве Літоўскім пасля смерці Вітаўта, бо той не пакінуў пасля сябе нашчадкаў па мужчынскай лініі. Вайна доўжылася з 1432-га па 1436 год паміж двума прэтэндэнтамі на вялікае княжанне — родным братам Вітаўта Жыгімонтам Кейстутавічам і родным братам Ягайлы Свідрыгайлам Альгердавічам. Дынастычная барацьба паміж сваякамі разгарэлася на фоне рэлігійных супярэчнасцяў паміж праваслаўнымі, якія падтрымлівалі Свідрыгайлу, і каталікамі, якія выступілі на баку Жыгімонта. Апошні выйшаў у гэтым супрацьстаянні пераможцам.

На думку гісторыка Васіля Вароніна, скарб быў схаваны ля вёскі Літва ў выніку бітвы, што адбылася ў жніўні 1433 года ля вёскі Капачы, усяго за сем кіламетраў ад месца яго знаходкі. Бітва была пераможнай для войскаў Свідрыгайлы. Напэўна, менавіта падчас уцёкаў з поля бою разбітыя прыхільнікі Жыгімонта ў спешцы схавалі сваю скарбніцу, дзе, акрамя тысяч манет, захоўваліся і каштоўныя паясы, адзін з якіх мог належаць самому Вітаўту. А ці сапраўды ён належаў Вітаўту ці камусьці з яго набліжаных, цяпер сказаць немагчыма. Ды і ці варта?

**Мікалай ПЛАВІНСКІ.**